УДК 37(477+476.4)(091)«16/17»

*Аляксандр Агееў*

# Магілёўска-украінскія ўзаемаўплывы і запазычанні ў школьнай адукацыі XVII–XVIII ст.

*У XVII–XVIII ст. украінскія і магілёўскія ўзаемасувязі і ўзаемаўплывы ярка выявіліся ў галіне асветы і школьнай адукацыі. Вучэбны працэс магілёўскіх брацкіх школ рэгламентаваўся статутамі ў аснове якіх ляжалі прынцыпы распрацаваныя ў статуце Львоўскай брацкай школы. У Магілёве і каля яго працавалі такія вядомыя асветнікі і педагогі, як Спірыдон Собаль, Лаўрэнці Зізані, Мяленці Сматрыцкі, Георгі Каніскі. Плённасць украінска – магілёўскіх культурных сувязяў засведчана часам.*

***Ключавыя словы****: Асвета, школьная адукацыя, Украіна, Магілёў, Львоўская брацкая школа, Спірыдон Собаль, Мяленці Сматрыцкі, Георгі Каніскі.*

*In the 17–18 centuries and inter-relations and mutual influences between the City of Mahileu and Ukraine strongly manifested themselves in the areas of education and schooling. The educational process of the brotherhood's school in Mahilioŭ was regulated by charters based on the principles established in the charter of the Lviv brotherhood school. Among the well-known educators working in Mahilioŭ and its suburb there were such well-known teachrs as Spiridon Sobol, Lawrence Zizaniya, Meletius Smotrytsky, Georgy Konissky. The prolific outcomes of the Ukrainian-Mahilioŭ cultural relationship was very fruitful.*

***Keywords****: Education, School building, Ukraine, Mahilioŭ, Lviv brotherhood's school, Spiridon Sobol, Meletius Smotrytsky, Georgy Konissky.*

Старабеларуская культура перажывала ў XVI – пачатку XVII ст. перыяд росквіту. Невыпадкова, у гэты час на беларускіх землях фарміруецца сістэма асветы адпаведная Новаму часу: узнікаюць пратэстанцкія, каталіцкія і праваслаўныя школы. Яны ўсё шырэй адкрываюцца пры манастырах, саборах, цэрквах і зборах. Аб дзейнасці першых навучальных устаноў на Магілёўшчыне засталося вельмі мала сведчанняў. Тым не менш, гістарычныя дакументы відавочна паказваюць, што ў XVII–XVIII ст. украінскія і магілёўскія землі знаходзіліся ў адзінай культурнай прасторы, а іх узаемасувязі і ўзаемаўплывы ярка выявіліся ў галіне асветы і школьнай адукацыі, найперш праваслаўнай.

Першапраходцамі новага этапу развіцця асветы і адукацыі на беларускіх землях можна лічыць кальвіністаў і арыян, якія здолелі стварыць у другой палове XVI – пачатку XVII ст. сваю школьную сетку. На ўсходніх землях Беларусі найбольш шырокае распаўсюджванне сярод пратэстанцкіх плыняў атрымаў кальвінізм. Гэтага веравызнання сталі прытрымлівацца многія багатыя і ўплывовыя князі і магнаты, якія выдавалі кнігі, адкрывалі школы, садзейнічалі вывучэнню роднай мовы. У 1570 г. ў Беларусі налічвалася 163 кальвінскіх зборы. На Магілёўшчыне яны дзейнічалі ў Магілёве, Оршы, Шклове [2, с. 141].

Каталіцкія навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены саборнымі, кафедральнымі, манастырскімі, дыяцэзіяльнымі школамі. Магнатаў абслугоўвалі прыватныя педагогі. Станаўленню навукі, развіццю еўрапейскай сістэмы адукацыі ў Беларусі садзейнічала дзейнасць каталіцкай арганізацыі «Таварыства Езуса». У XVII ст. намаганнямі езуітаў школы і калегіумы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

былі створаны ў Оршы, Бабруйску, Магілёве, Мсціславе і іншых гарадах ўсходняй Беларусі [2, с. 119]. Невялікія школы існавалі пры езуіцкіх рэзідэнцыях і місіях ў Клімавічах і Расна. Езуіцкія школы давалі агульнадаступную, бясплатную адукацыю на дастаткова высокім узроўні. З мэтай прыцягнення моладзі ў езуіцкія школы навучанне ў іх вялося не толькі на лацінскай, польскай, але і на беларускай мовах.

Адзін з самых вядомых на Беларусі Аршанскі езуіцкі калегіўм быў адкрыты ў 1612 г. У 1740–70 гг. калегіўм стаў вышэйшым з няпоўным курсам філасофіі. Пры ім жа была адкрыта музычная бурса для дзяцей беднай шляхты. У гэтым калегіўме быў распрацаваны і выдадзены «Аршанскі кодэкс» – зборнік папулярных драм і інтэрмедый эпохі барока, якія ставіліся ў тэатрах многіх гарадоў Рэчы Паспалітай [10, с. 125–128]. У Магілёве езуіцкая рэзідэнцыя, заснаваная вядомым царкоўным дзеячам Я. Здановічам, дзейнічала з 1680 па 1779 гг. Рэзідэнцыі падпарадкоўваліся езуіцкія місіі ў Гомелі, Фащеве, Хальчы, Чачэрску і інш. Каля 1684 пры рэзідэнцыі была адкрыта музычная бурса, з 1691 працавала школа. З 1740 ў калегіўме было ўжо пяць класаў [3, с. 334].

Развіццё пратэстанцкай і каталіцкай агульнадаступнай школьнай адукацыі мела відавочную празаходнюю арыентацыю і стала выклікам для праваслаўнай супольнасці, якая ўласнай адукацыйнай традыцыі да таго часу яшчэ не выпрацавала. Але адказ патрабаванням часу быў дастаткова хутка знойдзены. Праваслаўнае насельніцтва не жадала саступаць прадстаўнікам іншых веравызнанняў як ў плане матэрыяльнага дабрабыту, так і ў духоўнай сферы. У 1585 г была адкрыта брацкая школа ў Вільні, а ў 1586 пачала працаваць Львоўская школа, якая стала першай брацкай школай на ўкраінскіх землях. Пры падтрымцы праваслаўнай шляхты ў канцы XVI – пачатку XVII стагоддзяў у Вільне, Львове, Магілёве, Брэсце, Луцку, Галоўчыне, Кіеве, Мінску, Пінску, Слуцку, Крычаве, Мсціславе, Оршы, Шклове, Полацку і іншых беларускіх і ўкраінскіх гарадах утвараюцца буйныя праваслаўныя брацтвы. Гэтыя рэлігійна-нацыянальныя арганізацыі праваслаўнага гарадскога насельніцтва Беларусі і Украіны ў XVI–XVIII ст. арганізуюць свае брацкія школы. На пачатку XVII ст. ў Рэчы Паспалітай існавала ўжо каля трыццаці такіх школ. З пункту гледжання агульнаеўрапейскіх працэсаў іх ўзнікненне можна разглядаць у кантэксце станаўлення гарадскіх і цэхавых школ Еўропы.

Магілёў дазвол на стварэнне гарадской школы атрымаў разам з наданнем яму Стэфанам Баторыем магдэбургскага права ў 1577 г., але ва ўмовах Лівонскай вайны горад не здолеў ім скарыстацца. Толькі ў 1590–92 гг., але ў ліку першых на беларускіх землях, магілёўскія мяшчане стварылі ў горадзе братэрства і адкрылі брацкую школу пры Спаскім манастыры [2, с. 53]. У Магілёўскай, як і ў Віленскай школах, з самага пачатку выкладалі чатыры мовы: царкоўнаславянскую, «простую мову» (беларускую), латынь і польскую, а таксама вывучалі: дыялектыку, рыторыку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію, геаграфію. Навучанне вялося на царкоўна-славянскай і беларускай мовах [5, с. 22–23, 54]. Выкладанне ў ёй з моманту заснавання лацінскай і польскай моваў вылучае магілёўскую школу з ліку іншых брацкіх школ на тэрыторыі Беларусі.

У гэты жа перыяд узнікаюць брацкія школы ў Шклове, пры Баркулабаўскім манастыры, у Куцейна пад Оршай і Буйнічах пад Магілёвам. У школах навучаліся дзеці розных слаёў гарадскога насельніцтва. У большасці брацкіх школ акрамя моў яшчэ вывучаліся: дыялектыка, астраномія, арыфметыка, музыка, а вось гісторыя і геаграфія, як асобныя прадметы не выкладаліся.

Вучэбна-выхаваўчы працэс брацкіх школ рэгламентавацца статутамі, у аснове якіх ляжалі педагагічныя прынцыпы, распрацаваныя ў Статуце Львоўскай брацкай школы. У статуце Магілёўскай брацкай школы 1597 г. прама гаворыцца: «беручы прыклад з іншых мест», што хутчэй за ўсё ўказвае на запазычанне 1590 г вучэбнай праграмы Львоўскай брацкай школы [8, с 30]. Братэрства, якое наймала на працу настаўнікаў, строга сачыла за іх працай і маральнасцю, прад'яўляла ім дастаткова строгія патрабаванні. Статут падаваў настаўніку права «не тыранскі, але настаўніцкі» караць вучняў [6, с. 41, 93]. Ён таксама рэгламентаваў змест навучання. Выхаванне дабрачыннага хрысціяніна было галоўнай задачай выхаваўчага працэсу таго часу [7, с. 27–29].

Першымі настаўнікамі ў магілёўскай школе былі ў асноўным выхадцы з Кіева: Кассовіч – «студэнт з Кіева» навучаў латыні; Цімафей Грыбач і Павел Іеўлеў – рускаму чытанні; Афанасій Стралецкі – «пачаткам латыні»; Фёдар Тарасовіч – маральнасці. Вядомыя імёны настаўнікаў: Каткоўскі, Фама Тавбаровіч і Радко, Ігнат Іевлевіч, Д. Макарэвіч, Васілеўскі, Сава Андрэевіч, які меў ступень магістра, а значыць вучыўся ў нейкім універсітэце [5, с. 56–57].

У 1624 г будынак магілёўскай школы перайшоў да ўніятаў, аднак ў 1633 выкладанне аднавілася. Пасля таго, як рускія войскі занялі Магілёў у 1654 г., цар Аляксей Міхайлавіч дараваў брацкаму вучылішчу правы, роўныя з кіеўскай школай. Пасля вяртання горада ў склад Рэчы Паспалітай ў 1667 г. выкладанне ў школе па-ранейшаму адбывалася па праграме кіеўскай калегіі.

Нягледзячы на ўсе адметнасці, на думку многіх беларускіх даследчыкаў, свядома ці падсвядома педагагічная думка развівалася ў агульнаеўрапейскім напрамку. Адной з істотных асаблівасцяў праваслаўнай педагогікі, якая адрознівае яе ад гуманістычнай педагогікі эпохі Адраджэння, з'яўляецца амаль поўнае ігнараванне ёю гісторыі. Калі ў еўрапейскіх школах выхоўвалі і навучалі навучэнцаў на прыкладах антычных і сярэднявечных герояў, то прымяненне такой практыкі ў брацкіх школах не сустракаецца [8, с 31]. Станаўленне беларускіх і ўкраінскіх брацкіх школ ва многіх момантах нагадвае працэсы развіцця гарадскіх і цэхавых школ Італіі, Германіі, Францыі.

Брацкія друкарні Украіны і Беларусі выдалі вялікую колькасць вучэбных дапаможнікаў для школ. Першыя ў Беларусі друкарні з'явіліся разам з Вільняй, Брэстам і Нясвіжам на ўсходзе краіны ў Куцейна пад Оршай (1630–1654), Буйнічах (1635) і Бялынічах (1638–1653) пад Магілёвам. Асабліва актыўна мясцовае кнігадрукаванне пачала развівацца з пачатку XVII ст., калі ў 1616 г. была створаная друкарня пры Магілёўскім брацтве, якая з перапынкамі працавала да 1773 г Магілёў і Куцейна сталі галоўнымі цэнтрамі кірылічнага кнігадрукавання Беларусі з другой чвэрці XVII ст. Менавіта ў гэты час склалася Магілёўская школа гравюры [1, с. 26].

Магілёўскія друкарні былі вядомы далёка за межамі нашага рэгёна і надалей. З канца XVII і на працягу XVIII ст. толькі ў Магілёўскай брацкай друкарні выдадзена мноства царкоўна-службовых кніг: «Псалтыры», «Часасловы», «Акафісты», «Малітвасловы», «Катэхізісы», «Ірмалоі» і інш. У XVIII ст. Магілёўская брацкая друкарня засталася адзінай у Беларусі. У ёй было надрукавана больш за 300 кніг на старaславянскай мове, у тым ліку па замовах старавераў,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёўскія выданні шырока выкарыстоўваліся ў школьнай адукацыі, у тым ліку ва Ўкраіне, бо, як ведама, паняцці «малітоўная» і «вучэбная» кніга ў тыя часы ў значнай ступені збліжаліся паміж сабой.

Сярод выбітных асобаў асветы і школьнай адукацыі, спадчыну якіх немажліва і непатрэбна дзяліць украінцам і беларусам, бо яна ўзбагачае абодвы народы, перш наперш вылучаюцца імёны Лаўрэнція Зізанія, Мяленція Сматрыцкага, Спірыдона Собаля, Георгія Каніскага.

На мяжы XVI–XVII ст. у Буйнічах пад Магілёвам настаўнічаў беларускі і ўкраінскі асветнік, педагог царкоўны дзеяч Лаўрэнці Зізані. Ён працаваў выкладчыкам брацкіх школ у Львове, Брэсце, Вільні, хатнім настаўнікам сына крычаўскага старасты Б. Саламярэцкага (1597–1600), дзяцей князя А. К. Астрожскага, пасля ў князя Я. Карэцкага на Валыні. У 1596 у Вільні Зізаній надрукаваў першую ў Беларусі і Ўкраіне азбуку «Наука ку читаню и розуменю писма словенскаго» з малюнкамі ў тэксце, у якую ўключыў «Лексіс…» – тлумачальны слоўнік (на 1061 слова), які дзякуючы звесткам па гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўстве аблягчаў разуменне царкоўнаславянскай мовы. У гэтым жа годзе была ім выдадзена «Грамматіка словенска съвершеннаго искуства осми частій слова.» Буквар і граматыка Зізанія мелі значны ўплыў на развіццё мовазнаўчай навукі ўсходніх і паўднёвых славян.

Свой уклад у развіццё брацкіх школ Беларусі ўнёс беларускі і ўкраінскі асветнік, пісьменнік-палеміст, царкоўны і грамадскі дзеяч, аўтар вядомай «Граматыкі славенскай…» Мяленці Сматрыцкі. Вядома, што з 1600 г. Сматрыцкі жыў і настаўнічаў у князя Б. Саламярэцкага ў вёсцы Баркулабава на Магілёўшчыне (па іншых звестках у Буйнічах).

Яскравым прыкладам сувязяў і ўзаемаабагачэння школьных сістэм Магілёўшчыны і Кіеўшчыны з'яўляецца біяграфія беларускага асветніка XVII ст. Спірыдона Собаля. Будучы рэктар Магілёўскай і Кіеўскай брацкіх школ, які першым увёў паняцце «Буквар», нарадзіўся ў Магілёве ў сям'і магілёўскага бурмістра Б. І. Собаля ў канцы XVI ст. Верагодна, адукацыю атрымаў у Кіеве. У Магілёўскай брацкай школе пачаў працу настаўнікам, а затым стаў яе рэктарам. З 1624 г. пачынаецца яго настаўніцкая праца ў Кіеўскай брацкай школе, дзе ў 1626 яго абіраюць яе рэктарам.

Значна лепш нам ведамы друкарскі перыяд жыцця асветніка. У 1628–1630 гг. у Кіеве каля Васкрасенскай царквы на Падоле Спірыдон Собаль друкаваў кнігі ў доме мітрапаліта Іова Барэцкага, пасля смерці якога вяртаецца ў Беларусь. З 1630 г. ў Куцейна пад Воршай і затым у Буйнічах пад Магілёвам (каля 1635), Собаль прымае ўдзел у заснаванні друкарняў, у якіх працягвае друкаваць кнігі. Акрамя кніг для царквы Собаль выдаваў кнігі для хатняй малітвы, кнігі маральна-павучальнага зместу, пераклады з грэцкай мовы і буквары. Менавіта дзякуючы апошнім ён найбольш вядомы.

На сённяшні дзень адзіны вядомы экземпляр першага «Буквара» Собаля захоўваецца ў Музеі ўкраінскага мастацтва ў Львове. Яго можна лічыць першым беларускім спецыялізаваным падручнікам. Сьпірыдон Собаль ня толькі надрукаваў першы «Буквар», але і ўпершыню ўвёў ва ўжытак само слова «Буквар», якое пазней замацавалася як назва першага падручніка, па якім дзеці пачынаюць вучыцца чытаць і пісаць. «Букварь сиречъ, начало ученіа детем начинающим чтенію извыкати» быў выдадзены ў Куцейна ў 1631 і 1636 гг. і ў Магілёўскай брацкай друкарні «Букваръ языка славеньска» у 1636 г

Куцеінскі «Буквар» утрымліваў першапачатковыя веды пра граматыку, якія давалі магчымасць авалодаць тэхнікай пісьма і чытання. Кніга мела 40 аркушаў. Яна стала шырока вядома ва Ўкраіне, ВКЛ і Масковіі. 44 літары алфавіту, вялікія і маленькія, спачатку друкаваліся ў звычайным, а затым у зваротным парадку. Пасля ішлі двух і трохлітарным склады. Далей навучэнцам прапаноўваліся словы на асобныя літары. У буквары ўтрымліваюцца звесткі аб націску, знаках прыпынку, скланенні назоўнікаў і прыметнікаў, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў. Пад назвай «Парадеігмата» была прадстаўлена табліца пяці скланенняў старaславянскай мовы. Спецыяльны раздзел яго чытанкі быў прысвечаны хрысціянскім запаведзям, накіраваным на фарміраванне высокіх маральных якасцяў.

У Магілёўскай брацкай школе ў 20-я гады XVII ст. вучыліся вядомыя праваслаўныя дзеячы Ігнат і Фама Іеўлевічы. Узровень атрыманых ведаў дазволіў ім паступіць адпаведна ў Замойскую і Кракаўскую акадэміі. Фама Якаўлевіч Іеўлевіч (Евлевіч) – культурны і рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай, польскамоўны паэт, гуманіст нарадзіўся ў Магілёве, у 1628–31 гг. быў рэктарам Кіеўскай брацкай школы. Пасля ўтварэння Кіева-Магілянскага калегіўма вярнуўся ў Магілёў. Сярод твораў Іеўлевіча – вядомая польскамоўная паэма «Лабірынт», адзначана ярка выяўленай рэнесансна-гуманістычнай скіраванасцю.

Сын украінскага народа Георгій Каніскі, які атрымаў адукацыю і пачаў педагагічную дзейнасць ў Кіева-Магілянскай акадэміі, стаў найвядомейшым беларускім праваслаўным царкоўным дзеячам і асветнікам XVIII ст. У 1745–55 гг. Каніскі быў выкладчыкам, прафесарам, рэктарам Кіева-Магілянскай акадэміі. З 1755 ён узначаліў Магілёўскую епархію і ўжо ў 1757 г. адкрыў школу, а ў 1759 – духоўную семінарыю. Каніскі ўнікаў ва ўсе пытанні семінарыі: запрашаў выкладчыкаў з Кіева, складаў праграмы, друкаваў падручнікі, прызначаў дараванне настаўнікам, размяркоўваў курсы навучання, ставіў на чале семінарыі вопытных кіраўнікоў [7, с. 31, 35]. Вядомы імёны некаторых настаўнікаў адкрытай Георгіем Каніскім семінарыі. Сярод іх нямала ўраджэнцаў Украіны і навучэнцаў Кіеўскай акадэміі.

Так, Аляксандр Старынкевіч нарадзіўся ў 1755, навучаўся ў Кіеўскай акадэміі, тры гады працаваў настаўнікам Магілёўскай семінарыі, а з 1788 быў пасвечаны ў сан святара і стаў законанастаўнікам Высакароднага Шклоўскага кадэцкага корпуса. Вучылішча было заснавана 24 лістапада 1778 г. на сродкі Сямёна Зорыча – фаварыта Кацярыны II для дзяцей бедных дваран, а ў 1799 г. пераўтворана ў кадэцкі корпус. Шклоўскае высакароднае вучылішча стала першай навучальнай установай, якое можна лічыць свецкай сярэдняй школай на Магілёўшчыне. Старынкевіч затым служыў шклоўскім протаіерэем і вызначаўся талентам прамоўцы і прапаведніка. За гэта ён меў непрыемнасці напрыканцы сваёй кар'еры, бо, відаць з-за украінскага тэмпераменту, парушаў указ сінода «аб негаварэнні прапаведзей без папярэдняй цэнзуры» ад 1800 г. [4, с. 1–3].

Георгій Каніскі «сыскаў» «сына казачага» з маларасійскага горада Харола (верагодна Палтаўскай вобласці) Сампсона Васільевіча Цвяткоўскага, які ў 1781 скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію. Ён напачатку быў настаўнікам паэзіі і рыторыкі. а пазней філасофіі і багаслоўя. Па сведчанню Георгія Каніскага паводзіў сябе «чэсна і добрапрыстойна». Невыпадкова ў 1789 г. Цвяткоўскі заняў пасаду дырэктара народных вучылішч Магілёўскай губерні і з моманту заснавання ўзначальваў Магілёўскае галоўнае народнае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучылішча, а з 1809 г. стаў першым дырэктарам Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Вядомы сваімі асветніцкімі ідэямі педагог займаў гэтую пасаду да 1815 г. [9, с. 11].

Штат згаданага Магілёўскага галоўнага народнага вучылішча складаў дырэктар, два настаўнікі старэйшых класаў, настаўнік 2-га класа, настаўнік 1-га класа, настаўнік замежнай мовы і настаўнік малявання. І зноў два настаўнікі былі родам з Украіны. Настаўнік другога класу Іван Гарбачэўскі «сын свяшчэнічаскі», выхадзец з Бярэзінскага павету намесніцтва Чарнігаўскага, навучаўся Чарнігаўскай семінарыі, потым у Санкт-пецярбургскай настаўніцкай семінарыі. Настаўнік першага класа і рысавальнага маста-цтва Якаў Сімановіч «сын свяшчэнічаскі, родам з Маларасіі», Шэўскага намесніцтва, павета Залатаношскага, вучыўся спачатку ў Пераяслаўскай семінарыі, потым у Еіеўскай духоўнай акадэміі [7, с. 52].

Плённасць украінска – магілёўскіх культурных сувязяў засведчана часам. Узорам і своеасаблівым метадычным цэнтрам (калі казаць сучаснаю мовай) для магілёўскай брацкай школы быў статут Львоўскай брацкай школы, а пазней праграмы кіеўскага калегіўму. Відавочна, што для праваслаўнай школьнай адукацыі XVII–XVIII ст. цэнтрам падрыхтоўкі школьных кадраў стаў Кіеў. Існаваў адзіны рынак працы настаўнікаў. Назіралася ўзаемная ратацыя настаўнікаў, пры гэтым пераважаў рух настаўнікаў з Кіева на Магілёўшчыну. У выданні вучэбных дапаможнікаў вялікую ролю сыгралі магілёўскія друкарні. Нават пасля гвалтоўных падзелаў Рэчы Паспалітай значэнне ўкраінска – магілёўскіх сувязяў у галіне адукацыі захоўвалася, хаця і пачало паступова змяншацца, што было звязана як з крызісам Кіева-магілянскай акадэміі, так з тым, што на першы план па свайму ўплыву выходзяць расійскія імперскія цэнтры адукацыі і культуры.

**1**. *Агеев А. Г., Климуть Я. И., Пушкин И. А.* Перекрестки могилевской истории / А. Г. Агеев, Я. И. Климуть, И. А. Пушкин. – Мн.: ООО «Туринфо», 2004. – 216 с., 224 ил. **2**. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск: Народная асвета. 1985. – 464 с. **3**. *Блинова Т. Б.* Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с. **4**. *Горючко П. С.* Учителя Могилёвской духовной семинарии. Биографические материалы для времени 1765–1808 годов / П. С. Горючка. – Могилев губ.: Скоропечатня и литография Ш. А. Фридланда, 1904. – 50 с. **5**. *Жудро Ф. А.* История могилевского Богоявленского братства / Ф. А. Жудро. – Могилев на Днепре: Скоропечатня и литография Ш. Фридманда, 1890. – 112 с. **6**. *Константинов Н. А.* Очерки по истории среднего образования в России / Н. А. Константинов. – Москва: Учпедгиз, 1956. – 247 с. **7**. *Науменко В. В.* Очерки истории образования Могилевщины / В. В. Науменко, В. С. Богданов, А. Р. Агеев, под общ. ред. Л. С. Смотрицкого. – Могилев: МГОИРО, 2012. – 504 с. **8**. *Самусік А. Ф.* Магілёўская брацкая школа ў святле эвалюцыі агульнаеўрапейскай гуманістычнай сістэмы педагогікі XVI–XVII стагоддзяў / А. Ф. Самусік // Гістарычнае і сацыякультурнае развіццё Магілёва: зборнік навуковых прац / Уклад. І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. – Магілёў: Магіл. абл. узбуйн. тып., 2007. – С. 27–33. **9**. *Снопкова Е. И.* Образовательные учреждения Могилевской губернии накануне включения в состав Виленского учебного округа: историко-педагогический обзор (1772–1803 гг.) / Е. И. Снопкова // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. – № 1 (41). – 2013. – С. 4–15. **10**. *Шаршунов В. А.* Образование и наука дореволюционной Беларуси / В. А. Шаршунов. – Минск: УП «Технопринт», 2005. – 462 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова